ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

14 СНЕЖНЯ 1995 года
чацвер

№18 (1735)

*Ведай нашых*

## Аналагаў такіх працаў у свеце не існуе

***Лаўрэатамі прэміі імя А.Н.Сеўчанкі ў гэтым годзе сталі доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Анатоль Барысавіч Антаневіч і кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Андрэй Уладзіміравіч Лебедзеў за цыкл працаў па С*-тэорыі функцыянальна-дыферэнцыяльных аператараў. Прапаноўваем чытачам размову нашага карэспандэнта з лаўрэатамі.***

**— Дазвольце ад імя рэдакцыі і чытачоў "Беларускага універсітэта" павіншаваць з атрыманнем прэміі. Што ўяўляе сабой цыкл працаў, па якім яна атрымана, і ў чым сутнасць вашых даследаванняў?**

***А. Б.:*** Матэматычнае мадэліраванне рэальных працэсаў, як правіла, прыводзіць да некаторых ураўненняў, і задача матэматыкаў заключаецца ў іх вывучэнні і стварэнні метадаў пабудовы рашэнняў. Найбольш часта сустракаюцца і найбольш добра вывучаныя дыферэнцыяльныя ўраўненні. Такія ўраўненні ўзнікаюць пры мадэліраванні працэсаў, у якіх адбываюцца лакальныя (часціцы, размешчаныя побач, уплываюць адна на адну) узаемадзеянні. Аднак, сустракаюцца і больш складаныя працэсы — нелакальныя (часціцы размешчаюцца далёка адна ад адной). Яны апісваюцца ўжо якасна іншымі, так званымі функцыянальна-дыферэнцыяльнымі, ураўненнямі. Для вырашэння апошніх неабходны новы метад. Менавіта ён прапанаваны ў нашай рабоце.

***А. У.:*** Метад заснаваны на панясцях і фактах з другой матэматычнай навукі — тэорыі аператарных алгебраў. Гэта тэорыя развівалася незалежна ад тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў. Каля яе вытокаў стаяў адзін з самых выдатных матэматыкаў XX стагоддзя — Джон фон Нейман, які менавіта з дапамогай аператарных алгебраў стварыў матэматычны апарат для апісання квантавай механікі. З таго часу (асноватворныя працы Джона фон Неймана адносяцца да 30-40-х гадоў) тэорыя аператарных алгебраў развівалася і працягвае развівацца вельмі бурна, і цяпер немагчыма нават проста коратка пералічыць імёны вядомых навукоўцаў, якія ўнеслі ўклад у гэтую тэорыю: іх, напэўна, будзе некалькі дзесяткаў, і сярод іх, дарэчы, будзе шмат імёнаў савецкіх матэматыкаў, такіх як І.М.Гельфанд, М.А.Наймарк, Г.Я.Шылаў і інш.

Трэба, аднак, сказаць, што самі па сабе класічныя (г.зн. тыя, якія ўвасходзяць да фон Неймана) метады аператарных алгебраў не падыходзяць для рашэння функцыянальна-дыферэнцыйных ураўненняў, бо яны арыентаваныя на рашэнне іншых задач. Але нам удалося сінтэзаваць ідэі і апарат С*— алгебраў (С*— тэорыі) і тэорыі дынамічных сістэм ( гэта яшчэ адна матэматычная навука) і атрымаць новы агульны метад, які ўжо можна прымяняць для даследавання функцыянальна-дыферэнцыйных ураўненняў.



Андрэй Уладзіміравіч Лебедзеў

**— Як узнікла ідэя стварэння гэтага новага метада?**

***А. Б.:*** Яшчэ ў 60-я гады ва універсітэце працаваў семінар па функцыянальнаму аналізу, якім кіравалі А.М.Родаў, В.Ф.Жданові, М.І.Брыш. Семінар быў нават па цяперашніх мерках вельмі высокага ўзроўню, ён даў імпульс да развіцця многіх матэматычных даследаванняў у Беларусі. Для мяне, у прыватнасці, вывучэнне на семінары разнастайных накірункаў дазволіла заўважыць аналогіі паміж істотна адрознымі тэорыямі. Гэта тэорыя псеўдадыферэнцыяльных аператараў, поспехі якой звязаныя з імёнамі С.Р.Міхліна, Дж.Кона, Л.Нірэнберга, Л.Хермандэра, тэорыя сінгулярных інтэгральных ураўненняў са зрухам, якая развівалася вучнямі акадэміка АН БССР Ф.Д.Гахава, алгебраічная тапалогія і тэорыя аператарных алгебраў. У выніку была заўважана магчымасць выкарыстаць ідэі тапалогіі і тэорыі аператарных алгебраў для даследавання задач з іншай галіны. Гэтую ідэю ўдалося рэалізаваць за 20 гадоў працы.

***А. У.:*** Я даведаўся пра гэтыя ідэі ад Анатоля Барысавіча ў 1973 годзе, калі навучаўся на другім курсе механіка-матэматычнага факультэта БДУ. Чаму яны мяне зацікавілі — цяжка адказаць. Пад уздзеяннем Анатоля Барысавіча мы разам з маімі сакурснікамі Міхаілам Белаусавым і Валерыем Брэнерам (абодва потым у сваіх дысертацыях зрабілі шэраг нетрывіяльных крокаў у развіцці гэтай тэорыі) займаліся, так бы мовіць, "павышэннем матэматычнай культуры": вывучалі нейкія (потым зразумеў, што зусім не "нейкія") кнігі, артыкулы з замежных часопісаў на англійскай, французскай, нямецкай мовах. Анатоль Барысавіч скіраваў мяне на распрацоўку новых ідэй, бо нават той навукі, якая потым стварыла С*— тэорыю функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў яшчэ не было. Распрацоўцы гэтых ідэй я прысвяціў і сваю кандыдацкую дысертацыю, якую абараніў у 1980 годзе.



Анатоль Барысавіч Антаневіч

Тут, дарэчы, адбылося пэўнае "шчаслівае супадзенне". У канцы 60-х гадоў у працах амерыканскіх матэматыкаў У.Арвесона і К.Джозефсона і ў сярэдзіне 70-х гадоў у працах ірландскага матэматыка Д.О'Донавана быў вырашаны шэраг праблем тэорыі С*— алгебраў, і пры гэтым быў створаны такі матэматычны апарат, які хоць і не меў адносін да функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў, але падказаў мне не толькі ў якім накірунку "капаць", але і, у некаторым сэнсе, як "капаць".

***А. Б.:*** І гэтыя "раскопкі" яму добра ўдаліся. У сваёй дысертацыі Андрэй Уладзіміравіч з аднаго боку практычна даказаў, што вылучаныя гіпотэзы аб тым, якім павінен быць метад, верныя, а з другога боку атрымаў шэраг прынцыпова новых вынікаў, якія ўказвалі напрамак, у якім трэба весці далейшыя даследаванні. З гэтага моманту распрацоўка С*—тэорыі функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў пайшла вельмі інтэнсіўна. І сёння можна сказаць, што той метад, які мы пачыналі шукаць у 70-х гадах, створаны. Сведчанне таму — нашыя работы па С*— тэорыі.

***Даведка.***

***На цяперашні момант па гэтай тэме навукоўцамі Белдзяржуніверсітэта (Антаневічам, Лебедзевым, Рыўкіным, Брэнерам, Белаусавым і інш.) апублікавана звыш 100 артыкулаў у цэнтральных матэматычных часопісах былога СССР (Успехи математических наук, Функциональный анализ и его приложения, Известия АН СССР і інш.) і за мяжой. Больш за 80 з гэтага цыклу працаў належыць А.Б.Антаневічу і А.У.Лебедзеву. У 1988 годзе выйшла манаграфія А.Б.Антаневіча ў выдавецтве "Універсітэцкае", а ў 1994 годзе выйшла манаграфія А.Б.Антаневіча і А.У.Лебедзева ў выдавецтве "Longman" (сумеснае выдавецтва Лондана і Нью-Йорка).***

**— А можна параўнаць узровень, на якім знаходзяцца вашы вынікі, з замежнымі дасягненнямі ў гэтай галіне?**

***А. Б.:*** Калі мы прыступілі ў пачатку 70-х гадоў да стварэння метада, ніякіх асаблівых паралеляў і ўзаемасувязяў паміж тэорыяй аператарных алгебраў і тэорыяй функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў не было, так што мы адразу знаходзіліся, калі так можна выразіцца, на адзін крок наперадзе. У працэсе ж даследаванняў нам удалося не проста прымяніць метады С*— алгебраў для рашэння функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў, але і ў саміх С*— алгебрах, карыстаючыся ідэямі з функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў, распрацаваць шэраг якасна новых канструкцый. Тым самым мы апынуліся на два крокі наперадзе, і ў цяперашні час пакуль яшчэ даследаванні ў гэтай галіне за мяжой на такім узроўні не вядуцца.

(Заканчэнне на ст. 2)

**РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** вылічальнай матэматыкі, біяфізікі, беларускай літаратуры XX стагоддзя;

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ:** функцыянальнага аналізу, ураўненняў матэматычнай фізікі, фізічнай электронікі, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі (0,25 стаўкі);

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, вышэйшай алгебры, філасофіі і метадалогіі навукі, беларускай літаратуры XX стагоддзя, матэматычнага забеспячэння САПР, гісторыі філасофіі і логікі, неарганічнай хіміі, ядзернай фізікі (0,25 стаўкі);

**СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ** англійскай мовы гуманітарных факультэтаў;

**ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ** беларускай літаратуры XX стагоддзя;

**АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ** фізічнай электронікі.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" **14 снежня 1995 года.**

*Ведай нашых*

## Аналагаў такіх працаў у свеце не існуе

*(Пачатак на ст.1)*

***З водгука прафесара П.П.Забрэйкі на цыкл працаў А.Б.Антаневіча і А.У.Лебедзева: "Як было высветлена, прапанаваны аўтарамі пераход ад аналізу аператарных ураўненняў да аналізу адпаведных аператарных С*— алгебраў мае дадаткі не толькі ў тэорыі функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў, але і ў іншых галінах сучаснай матэматыкі... Атрыманыя вынікі, несумненна, з'яўляюцца выдатным укладам у развіццё як айчыннай, так і сусветнай матэматыкі; на маю думку, створаная С*—тэорыя функцыянальна-дыферэнцыяльных ураўненняў складзе гонар беларускай навукі".***

**— Калі ласка, некалькі слоў аб сабе.**

***А. Б.:*** З 1958 года — у Белдзяржуніверсітэце: студэнтам, аспірантам, выкладчыкам. Абараніў доктарскую дысертацыю ў 1989 годзе ў Маскоўскім універсітэце.

***А. У.:*** Нарадзіўся ў 1954 годзе ў Санкт-Пецярбургу. З 1960 года жыву ў Мінску. Скончыў механіка-матэматычны факультэт БДУ. У 1980 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю.

**— І ўсё ж, ці нельга як-небудзь проста патлумачыць для неспецыялістаў, што азначае гэтае слова "С*—тэорыя"? І якое практычнае прымяненне могуць мець вашыя даследаванні?**

***А. У.:*** Вас што менавіта цікавіць — "С" ці *?

**— І тое, і другое...**

***А. У.:*** Ну, калі ўжо зусім для неспецыялістаў (асабліва напярэдадні Калядаў і Новага года), то літара "С" ідзе ад назвы вядомай французскай правінцыі, а знак * (дакладней, колькасць гэтых знакаў) азначае колькасць стадый развіцця, якія прайшла тэорыя. Адсюль, дарэчы, вынікае і пэўнае яе практычнае прымяненне (для неспецыялістаў).

**— А калі сур'ёзна?**

***А. У.:*** Калі ўжо зусім сур'ёзна, то ў гэтым абазначэнні ўтрымліваюцца два важных матэматычных паняцці: літара "С" — першая літара слова "continnous" (бесперапынны), а значок * азначае пераход да так званага дваістага аб'екта. Цяпер стала больш зразумела?

***Даведка.***

***У наступным годзе ў выдавецтве "Longman" выходзіць другая манаграфія А.Б.Антаневіча і А.У.Лебедзева, прысвечаная далейшаму развіццю гэтай тэорыі.***

***Наташа Савельева***

*ДАІ паведамляе*

## Аперацыя "Пешаход" працягваецца!

Пасля правядзення аперацыі "Пешаход" у кастрычніку яе давялося працягнуць у лістападзе. Гэта выклікана далейшым павелічэннем дарожна-транспартных здарэнняў (ДТЗ), у якіх за 10 месяцаў загінула 107, паранена 645 чалавек. Толькі ў кастрычніку загінула 9, паранена 105 чалавек. 106 ДТЗ адбыліся пры ўдзеле дзяцей: параненыя 104, загінулі 8 дзяцей.

Першы снег — радасць для дзяцей, але і бяда. Так, двое хлапцоў на санках, не зважаючы на небяспеку, імчаліся з горкі, выехалі на праезджую частку і трапілі пад колы аўтамашыны.

Вадзіцель Адзінцоў А.С., кіруючы аўтамашынай "Опель-амега", зрабіў наезд на пешахода, які перабягаў праезджую частку перад аўтатранспартам. Гэтым пешаходам аказаўся У.І.Жураўлёў, інжынер БДУ, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. З пераломам левай галёнкі пацярпелы быў шпіталізаваны.

За час працягу аперацыі "Пешаход" было складзена 829 пратаколаў за парушэнне Правілаў дарожнага руху.

Спадарства, узаемныя добразычлівыя адносіны паміж вадзіцелямі і пешаходамі пры строгім выкананні Правілаў дарожнага руху — гарантыя бяспекі на дарогах!

***Дзяржаўтаінспектар Аляксандр Кудраўцаў***

*Віншуем!*

Студэнт III курса гістарычнага факультэта А.Сямёнаў стаў чэмпіёнам Рэспублікі Беларусь па гіраваму спорту.

Студэнт I курса гістарычнага факультэта А.Трачкоўскі заняў 3-е месца на чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па армрэстлінгу.

• • •

## Шэршэ ля фам!

Панаванне мужчынскіх імёнаў у падручніках гісторыі стварае ўражанне, што жанчыны адыгравалі ў ёй, гісторыі, другасную ролю. Аб тым, што гэта не так, шырокі чытач некалькі гадоў таму змог даведацца з кнігі французскага гісторыка Гі Брэтона. Аб тым, як жанчыны ўплывалі на гісторыю Беларусі, можна даведацца з кнігі Ірыны Масляніцынай і Міколы Багадзяжа "Слава і няслаўе". Тут чытач сустрэне імёны Еўфрасінні Полацкай, Барбары Радзівіл, Алены Глінскай, Марты Скаўронскай і многіх-многіх іншых.

Набыць гэтае выданне можна, між іншым, і ў кніжным кіёску галоўнага корпуса БДУ.

*Сакрэт фірмы*

Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія 20 снежня адзначае сваё 75-годдзе. Нягледзячы на такі ўзрост, БДПА імкнецца ісці ў нагу з часам: летась у пераліку новых спецыяльнасцей з'явіліся "гарадскі электратранспарт", "ювелірная вытворчасць", "біямедыцынскія прыборы" і г.д.

Тэхналагічнае абсталяванне акадэміі прызнанае лепшым з таго, што вырабляецца ў краінах былога Саюза, яно ўжо заваявала германскі рынак, а ў наступным годзе будзе выстаўляцца ў Чыкага.

Праграма святочнага дня пачнецца з пашыранага пасяджэння вучонага савета і плаўна пяройдзе ва ўрачыстым сход, на які запрошаны Прэзідэнт Беларусі, прадстаўнікі ўраду і кіраўніцтва тэхнічных ВНУ, у тым ліку універсітэтаў Германіі, ЗША, Францыі, Англіі, Бельгіі. Відавочна, будуць віншаванні ВНУ і навуковых устаноў, якія ў свой час выдзеліліся з БДПА: Беларуская аграрна-тэхнічнага універсітэта, Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута, Мінскага радыётэхнічнага універсітэта, Брэсцкага політэхнічнага інстытута, Полацкага дзяржаўнага універсітэта і інш.

# Памяці Іллі Рыгоравіча Некрашэвіча (1905-1993)

## Да 90-годдзя з дня нараджэння



У 1995 годзе навуковая грамадскасць Мінска адзначыла 90-годдзе з дня нараджэння віднага навукоўца і педагога, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР, прафесара Беларускага дзяржаўнага універсітэта Іллі Рыгоравіча Некрашэвіча. Яго памяці было прысвечана адно з секцыйных пасяджэнняў міждзяржаўнай навуковай канферэнцыі "Узаемадзеянне выпраменьванняў з цвёрдым целам", якая праходзіла ў Мінску ў кастрычніку 1995 года. У дакладах і выступленнях навукоўцаў, у тым ліку і яго вучняў, была дадзена высокая ацэнка піянерскіх даследаванняў І.Р.Некрашэвіча ў галіне кантактаў цвёрдых цел з газаразраднай плазмай.

Пад навуковым кіраўніцтвам Іллі Рыгоравіча і пры яго непасрэдным удзеле ўпершыню ў Беларусі ў цяжкія пасляваенныя гады распачаліся і атрымалі шырокае развіццё доследныя работы па вывучэнню з'яў, якія адбываюцца пры ўзаемадзеянні газаразраднай плазмы з паверхняй металічных электродаў, што ў далейшым аказала вялікі ўплыў на ход развіцця фізікі і тэхнікі электрычных кантактаў, атамнага спектральнага аналізу, электраэразійнай апрацоўкі металаў, плазменай тэхналогіі апрацоўкі складаных паверхняў металаў, нанясення і траўлення тонкіх павярхоўных слаёў.

На базе эксперыментальных даследаванняў дыскрэтнасці слядоў электрычнага разрада на паверхні электродаў, абумоўленых, на думку І.Р.Некрашэвіча, бесперапынным перамяшчэннем (міграцыяй) элементарных токавых каналаў, была створана так званая **міграцыйная** тэорыя электрычнай эрозіі металічных электродаў у кандэнсаваных электрычных разрадах. Крыху пазней мяркуемая прырода гэтай з'явы была пацверджаная эксперыментальна: была даказана страта праводнасці металам, які выпараецца, ад звышхуткага нагрэву (паўза тока), што і з'яўляецца прычынай перамяшчэння канала па паверхні электрода. Электраэразійная тэхналогія, у аснове якой ляжыць міграцыйная тэорыя І.Р.Некрашэвіча, і цяпер паспяхова развіваецца ў фізіка-тэхнічным інстытуце АН Беларусі, дзе яе аўтар доўгі час (12 год) па сумяшчальніцтву з асноўнай работай у Беларускім дзяржаўным універсітэце загадваў лабараторыяй электрафізікі.

Дыягнастычныя даследаванні нераўнаважных плазменных працэсаў, пачатыя І.Р.Некрашэвічам у 50-я гады, леглі ў аснову плазменай тэхналогіі апрацоўкі паверхні ў дачыненні да электронікі і мікраэлектронікі, распрацоўкі плазменных працэсаў траўлення і нанясення пакрыццяў шырокага ўжывання (абарончых, актыкаразійных, умацоўваючых, прасвятляючых, дэкаратыўных і інш.), стварэння сістэм спектральнага кантролю і аўтаматычнага кіравання названымі тэхналагічнымі працэсамі, якія ў цяперашні час шырока выкарыстоўваюцца ў народнай гаспадарцы.

Ілля Рыгоравіч Некрашэвіч быў адным з нешматлікіх фізікаў у Беларусі, якія былі не толькі сведкамі зараджэння і развіцця фізічнай навукі ў рэспубліцы (і ў прыватнасці — ва універсітэце), але і актыўным удзельнікам яе развіцця, рыхтаваў высокакваліфікаваныя кадры. Яго вучні паспяхова працуюць не толькі ў БДУ, але практычна ва ўсіх навучальных і навуковых цэнтрах фізіка-тэхнічнага профілю рэспублікі.

Значнасць навуковай спадчыны І.Р.Некрашэвіча выходзіць за рамкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, адным з першых выпускнікоў якога ён быў і якому прысвяціў больш за 60 гадоў сваёй працоўнай дзейнасці. Яго навуковыя ідэі працягваюць развівацца намаганнямі вучняў і паслядоўнікаў, прыносячы адчувальную карысць роднай Беларусі, грамадзянінам якой ён быў і якая памятае яго.

***Прафесар кафедры фізічнай электронікі А.А.Лабуда***

*Канферэнцыі*

## Фізікі сабраліся разам

**З 16 па 19 кастрычніка 1995 года ў Мінску праходзіла Першая Міждзяржаўная канферэнцыя "Узаемадзеянне выпраменьванняў з цвёрдым целам", арганізаваная Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Акадэміяй навук Беларусі.**

У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі, апроч беларускіх навукоўцаў, калегі з Расіі, Украіны, Польшчы, Францыі, Літвы. Усяго было больш за 100 удзельнікаў, 25 з іх — з замежжа. Было абмеркавана 26 вусных і каля 100 стэндавых дакладаў. Шмат паведамленняў было прадстаўлена маладымі фізікамі, якія працуюць у БДУ, АН Беларусі і іншых арганізацыях. Значная колькасць работ была выканана ў супрацоўніцтве навукоўцаў Беларусі і іншых краін — Польшчы, Германіі, Кітая.

На канферэнцыі разглядаліся актуальныя фундаментальныя і прыкладныя праблемы ўзаемадзеяння электронных і іённых пучкоў і плазменных плыняў, лазернага выпраменьвання з цвёрдым целам, радыяцыйныя эфекты ў паўправадніках і металах, мадыфікацыя ўласцівасцей разнастайных матэрыялаў, новыя тэхналогіі і абсталяванне.

Пасяджэнне секцыі "Узаемадзеянне плазмы з паверхняй" было прысвечана 90-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага фізіка, арганізатара даследаванняў па фізіцы плазмы, прафесара І.Р.Некрашэвіча.

У час правядзення канферэнцыі адбыліся пасяджэнні Другога беларуска-польскага сімпозіума "Вакуумная тэхніка і тэхналогія".

Прыемна было яшчэ раз пераканацца, што ў Беларусі склалася і працягвае актыўна працаваць прызнаная ў свеце навуковая школа ў галіне ўзаемадзеяння выпраменьванняў з рэчывам. Усе ўдзельнікі адзначылі паспяховую работу канферэнцыі і выказалі аднадушную думку аб неабходнасці яе рэгулярнага правядзення. Наступная канферэнцыя "Узаемадзеянне выпраменьванняў з цвёрдым целам" прызначаная на 6 чэрвеня 1997 года.

***Заг. кафедры фізікі цвёрдага цела, прафесар В.М.Анішчык***

***Заг. кафедры фізічнай электронікі, прафесар Ф.Ф.Камароў***

***Дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела У.М.Драко***

# Кніга і экслібрыс

**Якое багацце мудрасці і дабрыні вясёлай рассыпана па кнігах усіх народаў і часоў...**

**Л.М.Талстой**

Свае духоўныя багацці чалавечай мудрасці кнігі нясуць народу праз стагоддзі, з пакалення ў пакаленне, з адной дзяржавы ў другую, з горада ў горад, з бібліятэкі ў бібліятэку, і няма для іх перашкод ні ў часе, ні ў прасторы. А калі яны трапляюць у вір жыцця і лёс іх часм залежыць ад непрадбачных ці прыродных акалічнасцяў, дык у вырашэнні іх далейшага шляху не апошняе месца займае ўладальнік кнігі. Аднак потым ніякае ліхалецце не перашкодзіць кнігам зноў стаць для людзей крыніцай асветы і духоўнага ўзбагачэння.

Вось пра такія кнігі, якія маюць непаўторны і доўгі шлях, пойдзе гаворка далей. Гэта ў асноўным выданні XVIII, XIX і пачатку XX стагоддзя, якія сёння ўжо сталі бібліяграфічнай рэдкасцю і амаль кожная з іх мела не аднаго ўладальніка. Аднак сталася так (гл. артыкул "Добрая бібліятэка — вялікі скарб асветы і культуры" у газеце "Беларускі ўніверсітэт" за 12 кастрычніка 1995 года), што сёння яны захоўваюцца ва ўніверсітэцкай бібліятэцы ў аддзеле рэдкай і каштоўнай кнігі.

Аддзел падрыхтаваў і прапануе чытачам выставу выданняў, якія мелі сваіх уладальнікаў, а тыя, у сваю чаргу, аберагаючы кнігі, пакінулі на іх свой уладальніцкі знак, ці экслібрыс.

Лацінскае слова Ex-libris ("з кніг") сведчыць юрыдычнае права на валоданне кнігай. Экслібрыс, ці кніжны знак, ці ўладальніцкі знак, аддрукаваны на невялікім шматку паперы, гэта можа быць таксама штэмпель ці ўласнаручны подпіс, які ўказвае прозвішча і ініцыялы ўладальніка кнігі або назву ўстановы. Экслібрыс часта ўяўляе сабой які-небудзь малюнак, які падкрэслівае род заняткаў уладальніка кнігі, свет яго захапленняў і г.д. Экслібрысы звычайна размяшчаюцца на тытульным аркушы, вокладцы кнігі і яе адвароце, супервокладцы. Па форме і зместу яны падзяляюцца на шрыфтавыя, дэкаратыўныя, штэмпелевыя, сюжэтныя, гербавыя і суперэкслібрысы.

За гісторыю свайго існавання экслібрыс змог адлюстраваць складаныя гістарычныя з'явы, думкі людзей розных часоў. Ён жа з'яўляецца адным з зыходных пунктаў у даследаванні складу і гісторыі грамадскіх і прыватных кнігазбораў, дапамагае вызначыць лёс бібліятэк грамадска-палітычных дзеячоў, дзеячоў навукі, культуры. Лепшыя мастакі свету працавалі над стварэннем экслібрысаў, каб зрабіць іх найбольш прывабнымі і ўразлівымі.

На выставе экспануецца каля сотні кніг з экслібрысамі з былых прыватных і грамадскіх бібліятэк, дзяржаўных устаноў. Можна назваць прозвішчы былых уладальнікаў асабістых бібліятэк, асобныя кнігі якіх зараз захоўваюцца ў фондзе аддзела і дэманструюцца на выставе:

Суворын Аляксей Сяргеевіч (1834-1912) — вядомы рускі кнігавыдавец, журналіст канца XIX і пачатку XX стагоддзяў. Экслібрыс на яго кніжцы штэмпелевы, размяшчаецца на адвароце вокладкі ("Из библиотеки Алексея Сергеевича Суворина");

Міхайлоўскі М.К. (1842-1904) — вядомы рускі сацыёлаг, адзін з тэарэтыкаў народніцтва, літаратурны крытык. Экслібрысы на яго кнігах штэмпелевыя, размяшчаюцца на адвароце вокладак ("Библиотека Н.К.Михайловского"). У аддзеле захоўваецца каля 15 кніг з прыватнай бібліятэкі М.К.Міхайлоўскага;

Забелін Іван Ягоравіч (1820-1909) — рускі гісторык, аўтар прац па матэрыяльнай культуры і археалогіі. Экслібрысы на яго кнігах штэмпелевыя, размяшчаюцца на тытульным аркушы ("Библиотека Ивана Егоровича Забелина"). У аддзеле захоўваецца 5 кніг з яго кнігазбору;

Лаўроў П.А. (1856-1932) — вядомы філолаг-славіст, акадэмік АН СССР. Экслібрысы на яго кнігах штэмпелевыя, круглай формы, размяшчаюцца на тытульным аркушы і на адвароце вокладкі ("Библиотека П.А.Лаврова");

Шубінскі Сяргей Мікалаевіч (1834-1913) — генерал-маёр, займаўся гісторыяй і журналістыкай, заснаваў часопіс "Исторический вестник" у 1880 годзе і рэдагаваў яго. Экслібрыс на яго кнізе шрыфтавы, дэкаратыўны, размяшчаецца на адвароце вокладкі ("Библиотека Сергея Николаевича Шубинского");

Данілеўскі Рыгор Пятровіч (1829-1889) — вядомы рускі і ўкраінскі пісьменнік, пяру якога належыць раманы "Мировичь", "Княжна Тараканова", "Сожжённая Москва" і інш. Экслібрыс на яго кнізе шрыфтавы, дэкаратыўны, размяшчаецца на адвароце вокладкі ("Из библиотеки Григория Петровича Данилевского");

Драздоў С.Л. — беларускі дзеяч XIX — пачатку XX стагоддзя. На яго кнігах знаходзяцца два экслібрысы: сюжэтны з малюнкам, які падкрэслівае яго род заняткаў, і штэмпелевы. Размяшчаюцца яны на адвароце вокладкі і тытульным аркушы ("Библіотэка С.Л.Драздова").

Мноства кніг з уладальніцкімі знакамі, прадстаўленых на выстаўцы,— з грамадскіх бібліятэк і дзяржаўных устаноў: Цвярская публічная бібліятэка, Тургенеўская грамадская бібліятэка, Бібліятэка лейбгвардыі Літоўскага палка, Бібліятэка Полацкага кадэцкага корпуса, Бібліятэка Рускага Клуба ў Рызе і інш.

***Л.П.Міцкевіч, заг. аддзела рэдкіх і каштоўных кніг***

# Фірма, якая працуе дзеля здароўя студэнтаў

Усяго другі год у Белдзяржуніверсітэце існуе навукова-прамысловае прадпрыемства "МЕДИОР", арганізаванае пры садзейнічанні Навукова-тэхналагічнага парка і кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ. Практычна гэта адзіная фірма ў Беларусі, якая займаецца распрацоўкай і ўкараненнем прыбораў кантролю функцыянальнага стану студэнтаў і іх аздараўленнем. Трэнеры і выкладчыкі кафедры фізвыхавання ўжо сёння практычна выкарыстоўваюць створаныя прадпрыемствам узоры партатыўных вымяральнікаў і аналізатараў пульсу, прыстасаванняў карэкцыі і развіцця дыхання, аналізу мышачных намаганняў і інш.

Не сакрэт, што многія студэнты заняткі фізкультуры наведваюць з неахвотай і толькі таму, што гэта з'яўляецца абавязковым і не заўжды цікавым. Пра тое, што фізічная падрыхтоўка непасрэдным чынам уплывае на добрае самапачуванне і здароўе, яны ўзгадваюць не часта. У нечым віноўныя і трэнеры: яны не заўжды выкарыстоўваюць індывідуальны падыход да кожнага студэнта.

З'яўленне ў спортзале прыбораў прыносіць элемент ажыўлення ў сам ход заняткаў, выклікае ў студэнтаў цікавасць да магчымасці вызначэння іх асабістых паказчыкаў пры нагрузках. У сваю чаргу, эфектыўнасць практыкаванняў, якія дае выкладчык, залежыць ад наяўнасці ў яго тэрміновай інфармацыі аб стане студэнта. Некаторыя прыборы замацоўваюцца на сценах спортзалы і дазваляюць за некалькі секунд дакладна вымераць частату біцця сэрца пры дакрананні далонямі рук да спецыяльных датчыкаў. Іншыя — могуць запісаць паказчыкі работы сэрца і лёгкіх у маленькі прыбор, які знаходзіцца на самім студэнце. Пасля заняткаў камп'ютэр, падключаны да гэтага прыбора, цалкам расшыфруе запісаную інфармацыю і раздрукуе студэнту яго дыяграму, а выкладчык адзначыць неабходнасць зніжэння ці павелічэння нагрузкі. Медагляды, якія праводзяцца 1-2 разы ў год, не ў стане даць студэнту такія змястоўныя рэкамендацыі, неабходныя яму для ўмацавання здароўя. Таму так неабходныя прыборы, якія распрацоўвае "МЕДИОР", здольныя прасачыць за зменамі ў арганізме непасрэдна ў час навучальнага семестра.

Як расказвае дырэктар прадпрыемства, вядучы навуковы супрацоўнік, кандыдат тэхнічных навук В.І.Ярмалінскі, прыборы выклікалі зацікаўленасць на кафедрах фізвыхавання іншых ВНУ, Акадэміі фізвыхавання і спорту, у аздараўленчых цэнтрах рэспублікі. Вучэбна-метадычнае аб'яднанне пры Міністэрстве адукацыі і навукі Беларусі прапанавала прадпрыемству распрацаваць праект стварэння аўтаматызаванай сістэмы кіравання навучальна-аздараўленчымі нагрузкамі, якая магла б выкарыстоўвацца ва ўсіх ВНУ нашай дзяржавы. У распрацоўцы праекта актыўна ўдзельнічаюць прафесар кафедры фізвыхавання, доктар біялагічных навук У.М.Лебедзеў, дацэнт кафедры, кандыдат педагагічных навук Р.М.Меднікаў і навукоўцы іншых кафедраў універсітэта.

***К.Ткачэнка***

# Кожнаму студэнту — свой рахунак

Як паведаміў карэспандэнту "Беларускага ўніверсітэта" прарэктар па вучэбнай рабоце і сацыяльных пытаннях Анатоль Васільевіч Паўлаў. вакол новай формы выдачы заробку і стыпендыі паспела скласціся недарэчная сітуацыя, якая абрасла разнастайнымі чуткамі і плёткамі. Навошта трэба было ўводзіць гэтую новую форму?

Па-першае, у нас у краіне сёння склалася вельмі складаная крымінагенная сітуацыя. А да апошняга часу грошы ва ўніверсітэт вазіліся без усялякай аховы. Напрыклад, ва ўніверсітэце 10 тысяч студэнтаў, па 100 тысяч на стыпендыю кожнаму — гэта ўжо мільярд рублёў. І везлі гэтыя грошы вадзіцель, касір і хто-небудзь у якасці аховы. Выпадак увогуле беспрэцэдэнтны.

Па-другое, выдача стыпендый ажыццяўлялася праз старастаў. З аднаго боку, гэта зручна для студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце: староста прынёс і раздаў. А калі студэнт — мінчанін? Старасту пабачыць можна толькі на занятках.

Узнікала шмат нараканняў і скаргаў саміх студэнтаў (аж да пракуратуры), што некаторыя старасты, атрымаўшы стыпендыю, у час летняй сесіі ці канікул з'язджалі надоўга разам з грашыма. У выніку частка студэнтаў заставалася без стыпендыі на працягу 2-3 месяцаў.

Па-трэцяе, некаторыя студэнты скардзіліся і на тое, што ў нас, на жаль, існуюць і такія старасты, якія займаюцца паборамі (5-10 тысяч за выдачу стыпендыі з кожнага).

Па-чацвёртае, у некаторых старастаў здаралася недастача.

Таму і была ўведзеная гэтая сістэма. Гэта было не выпадковае, спантаннае рашэнне. Планавалася гэта яшчэ два гады таму. Яшчэ тады была дасягнута дамоўленасць з дырэкцыяй "Белбізнэсбанка", дзе знаходзяцца грошы Белдзяржуніверсітэта, і было прынятае рашэнне стварыць пры гэтым банку разлікова-касавы цэнтр для выдачы заробкаў і стыпендый.

Такая сістэма выдачы — найбольш прагрэсіўная форма, бо ў банку працуюць прафесійныя касіры, а не нашыя старасты, якія нават юрыдычна не могуць несці ніякай адказнасці. У разлікова-касавым цэнтры працуе 5 касіраў, і памылка кіраўніцтва ўніверсітэта была толькі ў тым, што ў адзін месяц адразу пусцілі ўсю масу студэнтаў. Утварыліся вялікія чэргі, за што кіраўніцтва прыносіць свае прабачэнні тым, хто быў вымушаны іх выстойваць.

Хочацца адзначыць, што Савет універсітэта практычна адзінагалосна падтрымаў гэтую ідэю. Як адзначыў А.В.Паўлаў, гэтую ідэю падтрымліваюць і студэнткі 2-га курса філфака, з якія ён размаўляў (Чаеўская Н., Бубнова А., Лермантава Т.).

Больш таго, было прынята рашэнне адкрыць яшчэ адзін такі разлікова-касавы цэнтр на тэрыторыі ўніверсітэцкага гарадка, каб супрацоўнікі і студэнты факультэтаў, якія знаходзяцца тут, маглі атрымліваць заробак і стыпендыю на месцы.

Калі ж Вы мінчанін і побач з Вашым месцам жыхарства ёсць філіял "Белбізнэсбанка", то Вы можаце адкрыць рахунак там, паведаміўшы пра гэта ў разлікова-касавы цэнтр. Тады Вам не трэба будзе хадзіць у разлікова-касавы цэнтр — усе грошы пералічаць на Ваш рахунак. Прычым усе гэтыя аперацыі будуць рабіцца бясплатна.

Апроч таго, перастае існаваць такое паняцце, як "дэпанент", бо нават у тым выпадку, калі Вы своечасова не атрымалі заробак альбо стыпендыю, грошы будуць спакойна ляжаць у банку і нават прынясуць нейкі працэнт.

Гэтая сістэма зручная і для выкладчыкаў: розныя віды выплатаў будуць ісці ім адразу на адзін рахунак, што прынясе эканомію часу. Па жаданню можна будзе здымаць усю суму адразу ці па частках.

Калі ж студэнты, адзначыў А.В.Паўлаў, захочуць захаваць старую сістэмы выдачы стыпендый, то яны могуць пайсці ў банк і аформіць даверанасць на старасту на атрыманне ім гэтых грошай. Пры гэтым староста будзе мець справу непасрэдна з банкам, а ўніверсітэт у выпадку накладак і нявыплат адказнасці несці не будзе.

Такім чынам, новая сістэма выдачы грошай не толькі зручная — яна яшчэ эканоміць час. А як толькі адкрыецца яшчэ адзін разлікова-касавы цэнтр, дык увогуле ўсе праблемы здымуцца.

Гэтая сістэма, па словах прарэктара, уводзілася толькі для зручнасці студэнтаў і выкладчыкаў. І гэта — абсалютна законная аперацыя, якая актыўна выкарыстоўваецца на Захадзе, а зараз і ў нас.

***Вольга Хадарэнка***

<u>*Наша здароўе*</u>

# Грып, грып штогод

Грып — вострае інфекцыйнае захворванне, якое выклікаецца вірусамі розных тыпаў. Характэрным для гэтага захворвання з'яўляецца вострая форма пачатку: высокая тэмпература цела, галаўны боль, паражэнне верхніх дыхальных шляхоў. Крыніцай заражэння служыць хворы чалавек, які пры размове, кашлі, чханні выдзяляе вірус у навакольнае асяроддзе.

Лячэнне таго, хто захварэў на грып, адбываецца пад назіраннем доктара ў хатніх умовах. Пажадана хворага змясціць у асобны пакой, выдзеліць яму індывідуальны посуд, які пасля выкарыстання трэба паласкаць кіпнем. Асобам, якія маюць кантакт з хворым, рэкамендуецца насіць чатырохслойную марлевую павязку. У сем'ях, дзе растуць маленькія дзеці і ёсць хворы на грып, дарослыя павінны насіць марлевыя павязкі і засцерагчы дзяцей ад пабочных кантактаў.

Хворым на грып у дамашніх умовах тройчы ў дзень мераюць тэмпературу, выкарыстоўваюць "хатнія" сродкі лячэння: гарачае піццё, інгаляцыі. Недапушчальна ў перыяд захворвання на грып бескантрольна ўжываць антыбіётыкі: выкарыстанне іх спрыяе развіццю ўскладненняў і выклікае алергізацыю арганізма. У кожным канкрэтным выпадку лячэнне павінен прызначаць доктар.

Пэўны эфект зніжэння захворвання на грып назіраецца пры правядзенні прафілактычных мерапрыемстваў (вакцынацыя і г.д.). Больш чым удвая зніжае верагоднасць захворвання змазванне насавых хадоў аксалінавай маззю. Выпрабаванымі сродкамі народнай медыцыны з'яўляюцца цыбуля і часнок. Іх рэкамендуецца ўжываць у ежу без кулінарнай апрацоўкі, з іх жа робяць і прэпараты для інгаляцыі (удыхаюць пару дробна нацёртай масы двойчы ў дзень па 10-15 хвілін), водныя настоі (2-3 зубкі часнака заліваюць 50 г кіпню, настойваюць адну гадзіну, капаюць у нос па 2-3 кроплі).

***Доктар 2-й гарадской клінічнай бальніцы Л.І.Алексяйчук***

# Скажы, што ты чытаеш...

Чалавек выбірае літаратуру па сваім гусце ў адпаведнасці з вобразам мыслення, узроўнем інтэлекту, схільнасцямі і, урэшце, настроем. І таму, паводле такога выбару, паводле захаплення тым ці іншым аўтарам, героем, можна скласці ўяўленне пра характар чалавека, сферу яго інтарэсаў. Скажы, што ты чытаеш, і я скажу, хто ты. Сцвярджэнне рызыкоўнае, але доля ісціны ў ім ёсць.

Усе асноўныя сюжэты ў літаратуры даўно складзены. Яны вандруюць, набываючы новыя рысы, нацыянальныя ці рэгіянальныя асаблівасці, прэтэндуюць на самастойнасць. Даніэль Дэфо, мусіць, здзівіўся б, даведаўшыся, што ў Егіпце яшчэ ў эпоху Сярэдняга Царства існаваў папірус "Пацярпеўшы караблекрушэнне", які апавядаў пра фантастычныя прыгоды чалавека, выкінутага на востраў. Гэтую акалічнасць можна разглядзець як праяву генетычнай ці інтуітыўнай памяці.

Канструкцыя сусвету вызначаецца не прадметамі, а сувязямі паміж імі. Пераносячы гэтую думку на літаратуру, можна сказаць, што спасцігнуць сапраўдную каштоўнасць твора можна толькі суадносячы яго з іншымі творамі мастацтва. "Калі назіральнік разглядае адзін аспект аб'екта, не бачачы цэлага, то ён не здолее належным чынам зразумець нават гэты адзін аспект",— сцвярджаў Э.Фром. Усё спасцігаецца праз параўнанне. Каб адчуць добрае, трэба ведаць, што такое кепскае. Чым больш чалавек развіваецца, тым грунтоўней становіцца сістэма яго ацэнак і параўнанняў.

Мне вельмі імпануе ідэя асацыятыўнага чытання, бо мысленне — гэта працэс узаемадзеяння розных асацыяцый у свядомасці чалавека. Успамін, такім чынам, ні што іншае, як паслядоўнае паўтарэнне гэтых асацыяцый. Нездарма ж кажуць, што для таго, каб згадаць нешта, трэба вярнуцца і паўтарыць усе свае дзеянні.

Чытаючы, мы даволі часта можам прасачыць заканамернасці развіцця сюжэту. І сутнасць, можа, не ў тым **што** напісана, а **як**. Чым грунтоўней і змястоўней "як", тым больш глыбокія думкі ўзнікаюць у нашай свядомасці. Думкі, якія, магчыма, ужо прысутнічалі ў нашай галаве, але да часу не знаходзілі славесна-вобразнага ўвасаблення. Літаратура, такім чынам, стымулюе пераход неакрэслена бясплотнай ідэі (можна назваць яе перад-думкай) у афармленую думку. Падмацуем гэтае сцвярджэнне даволі важкай, але, на мой погляд, слушнай цытатай з Р.Моўдзі:"Многія, відавочна, знаёмыя з тым, што калі даведваешся пра значэнне якогасьці новага слова, то на працягу некалькіх наступных дзён гэтае слова трапляецца табе пастаянна. Тлумачыцца гэта звычайна не тым, што слова сталі часцей вымаўляць вакол нас... Нагода хутчэй у тым, што гэтае слова прысутнічае, але паколькі мы не разумеем яго значэння, то наша свядомасць прапускае яго, не заўважаючы". Тое самае адбываецца з творам мастацтва. Пакуль мы не здольныя асэнсаваць яго, ён не будзе ўяўляць каштоўнасці для нашай свядомасці.

Вартасць чытання заключаецца не ў тым, колькі кніжак мы прачытаем, а ў здольнасці асэнсаваць прачытанае. выклікаць у памяці асацыяцыі з раней атрыманай інфармацыяй. Чым больш гэтай інфармацыі, тым глыбейшыя асацыяцыі ўзнікаюць. На жаль, мы занадта добра засвоілі, што мэта навучання — назапашванне інфармацыі. Наша вышэйшая (ды і сярэдняя) адукацыя ператварылася ў "нафаршыраванне" ведамі, калі беднаму студэнту прапануецца такі аб'ём інфармацыі, што не хапае часу і сілы асэнсаваць яе.

Менталітэт чалавека закладваецца, бадай што, да яго нараджэння і далей развіваецца ў адпаведнасці з выхаваннем. І тут вельмі важную ролю адыгрывае камунікатыўнае асяроддзе, у якім існуе чалавек, а гэта — сям'я, кола сяброў, навучальная ўстанова, інакш кажучы, сукупнасць тых людзей і грамадскіх інстытутаў, з якімі сутыкаецца чалавек на працягу жыцця. І першым такім інстытутам з'яўляецца школа, дзе вучаць усяму, толькі ЧЫТАЦЬ чамусьці не вучаць. Гаворка ідзе не ўласна пра навыкі, а пра культуру чытання, уменне арыентавацца ў вялікім кніжным свеце. Вопыт настаўніка паказвае, што вучні цудоўна аналізуюць творы, не чытаючы іх, і сачыненні пішуць на "выдатна". І як пасля можна ўшчуваць студэнта-завочніка, які пытаецца:"Мне трэба напісаць параўнаўчую характарыстыку вобраза Гамлета і вобраза Дон Кіхота. Ці трэба для гэтага чытаць "Гамлета"?"

Часта думаю, чаму досыць вялікая колькасць адукаваных людзей не разумее Дастаеўскага, Гётэ, Шэкспіра? Мусіць, таму, што каштоўны сэнс іх твораў схаваны якраз па-за радкамі, і яго трэба ўбачыць. Гамлет на пытанне, што ён чытае, адказвае:"Словы, словы, словы..." Твор можа застацца толькі плынню словаў, калі над ім не разважаць.

Часам здараецца так, што ўжо знаёмага пісьменніка ўспрымаеш зусім па-новаму. "Гэта адбываецца тады,— піша К.Юнг,— калі ў сваім развіцці наша свядомасць узбіраецца на новую ступень, з вяршыні якой мы нечакана пачынаем чуць нешта новае".

Функцыі чытання могуць быць самыя розныя. Скажам, мы проста хочам адпачыць і атрымаць асалоду ад цікавай кнігі. Гэтак атрымліваецца ў большасці. На жаль, у такой сітуацыі дамінуе чытанне так званай бульварнай літаратуры, ці "чціва", дзе дастаткова ўмення сачыць за сюжэтнай канвой. Ларошфуко з гэтай нагоды шматзначна заўважыў:"Многія чытаюць для таго, каб не думаць".

Ёсць чытанне з мэтай атрымаць нейкую інфармацыю, звесткі пра падзеі, з'явы, факты. Так чытаюцца газеты, часопісы, падручнікі, даведнікі.

Для філолагаў характэрны яшчэ адзін від чытання, мэта якога — пошук тропаў, рысаў пэўнага літаратурнага напрамку і г.д. Прычым, як паказвае практыка, гэты від чытання існуе не толькі як спадарожны, але і можа дамінаваць. Скажам, пры адборы матэрыялаў для курсавой ці дыпломнай работы.

Ці мэтазгодна чытаць адразу некалькі кніжак? Спытайце ў студэнтаў-філолагаў, якія кожную сесію здаюць па 2-3 літаратуры і ўжо, вядома ж, не надта дбаюць пра тое, ці варта адначасова чытаць Быкава, Катлярэўскага, Гросмана і Мільтана. Ну, гэта — хто на што вучыцца... А ў звычайных людзей мэтазгоднасць такога чытання найбольш праяўляецца, калі чытач імкнецца дасягнуць розных мэтаў, інакш кажучы, ажыццяўляюцца розныя функцыі чытання. Карысным з'яўляецца чытанне некалькіх кніг адразу з мэтай выяўлення іх агульных рыс (мова, распрацаванасць сюжэта і г.д.).

Ад чаго залежыць чытанне? Студэнты ўсміхнуцца: ад часу, які застаецца да экзамена, і аб'ёму літаратуры, якую трэба паспець прачытаць. Не, я зусім не пра сесію. Я пра тое чытанне, пасля якога ніхто не будзе дабівацца адказу на пытанне, чаму Карэніна кінулася пад цягнік. Чытанне найчасцей залежыць ад настрою. Часам мы не можам прачытаць кніжку ўласна таму, што наш настрой не супадае з настроем аўтара. І, па-другое, тэарэтычная падрыхтоўка мае істотнае значэнне. Наўрад ці непадрыхтаваны чытач "адужае" Д.Джойса.

Кажуць, каб змяніць свет, трэба зразумець яго. Літаратура спрыяе гэтаму. Скажы, што ты чытаеш, і я скажу, хто ты. Літаратура дапамагае разумець бліжняга, разабрацца ў сваіх думках, духоўна ўдасканальваць чалавека. Іншымі словамі, ведаючы асаблівасці мыслення, асабістыя густы чытача, можна арганізаваць ягонае чытанне такім чынам, каб пазбавіць яго ў кароткі тэрмін псіхалагічнага дыскамфорту, дэпрэсіі (скажы, што ты чытаеш, і я дапамагу табе). З другога боку, гэта дае магчымасць максімальна актывізаваць інтэлектуальную дзейнасць.

Скажы, што ты чытаеш...

***Ганна Бутырчык***

# Патрэбны Цэнтр мастацтва.

## *Няма крытыкі — няма мастацтва?*

Гісторыя мастацтва XX стагоддзя — гэта ў першую чаргу не гісторыя стыляў, а гісторыя філасофій. Кожны мастак стварае сваю карціну свету. Мастак XX стагоддзя — гэта філасоф, свядомасці якога ўжо паза рамкамі звыклага для нас успрымання рэчаіснасці. А мы, з'яўляючыся ў свядомасці кансерватарамі, часам увогуле не можам успрыняць формы праяўлення сучаснага мастацтва, а часцей нават не падазраем аб іх існаванні. Адбываецца гэта яшчэ і таму, што мы амаль не маем інфармацыі аб сённяшнім дні мастацтва. Вось пра гэта карэспандэнт нашай газеты і пагаварыў з навуковым супрацоўнікам Нацыянальнага мастацкага музея Вольгай Капёнкінай, адной з арганізатараў Міжнароднага навукова-практычнага семінара "Праблемы развіцця выяўленчага мастацтва ў постсацыялістычных краінах Усходняй і Цэнтральнай Еўропы", які адбыўся ў Мінску 20-24 лістапада.

Семінар быў падрыхтаваны Беларускім Фондам Сораса, Нацыянальным мастацкім музеем Беларусі і Нацыянальнай секцыяй Міжнароднай Асацыяцыі мастацкіх крытыкаў і стаў падзеяй для Мінска, паколькі нічога аналагічнага тут яшчэ не праводзілася. У яго рабоце прынялі ўдзел крытыкі з Беларусі, Расіі, Эстоніі, Польшчы, Балгарыі, Венгрыі, Францыі, Аўстрыі, Германіі. Удзельнікі фестывалю апісвалі мастацкую сітуацыю сваёй краіны, размаўлялі адзін з адным. Матэрыялы семінара будуць публікавацца ў часопісе "Пытанні мастацтвазнаўства" і, магчыма, будуць выдадзены Фондам Сораса асобнай брашурай.

Як высветлілася, шматлікая інфармацыя ў сферы мастацтва выпадае з поля зроку гледачоў і прафесіянальных мастацтвазнаўцаў. Існуе нейкая тусоўка мастакоў, нехта аказаў ім падтрымку, знайшлося памяшканне, дзе ладзіліся выставы. І ўсё цягнецца да таго часу, пакуль іх не выганяць. А для правядзення выставкі патрэбна ж яшчэ і спецыяльнае абсталяванне, якога таксама няма. Неабходна стварыць Цэнтр сучаснага мастацтва, у якім бы працавала група крытыкаў, філасофаў і нават гісторыкаў.

Семінару спадарожнічала адкрыццё шэрага выстаў, якія выявілі парасткі канцэптуальнай думкі ў Мінску. Маладым мастакам трэба даць магчымасць выказацца. Але для гэтага патрэбная эксперыментальная пляцоўка для выставаў, неабходны банк даных, інфармацыйны часопіс. Усім гэтым мусіў бы заняцца Цэнтр сучаснага мастацтва. Аб стварэнні такога цэнтра ўжо ідзе гаворка ў Фондзе Сораса. Аднак для гэтага патрэбна вельмі значная сума, якую Фонд адразу не зможа выдзеліць.

Калі гаварыць аб асобных аўтарах, дык хацелася б адзначыць праект "Дом дружбы народаў" А.Дурэйка, В.Фёдарава і іншых, які ўвасабляе групавую свядомасць маладых мастакоў. Замежных крытыкаў вельмі здзівіла тая акалічнасць, што многія з гэтых аўтараў былі выключаны з Акадэміі мастацтваў. Нехта нават усклікнуў: "Тады чаму ж у вас вучаць?" Бо ў кожнай еўрапейскай мастацкай акадэміі студэнты ў абавязковым парадку набываюць веды ў галіне сучаснага мастацтва.

Цікавым быў праект І.Цішына "Партызанская галерэя", які праходзіў у Доме мастацтваў. Канешне, вельмі шкада, што ў большасці выпадкаў выставы доўжыліся дзень-два. На большы час проста не ўдалося выпрасіць памяшканне.

Безумоўна, вельмі важна вывучаць, аналізаваць і даследаваць формы і з'явы, якія існуюць у сучасным мастацкім жыцці. Таму навукова-практычны семінар паклаў пачатак праекту падтрымкі ўключэння краін былога сацыялістычнага блока ў агульную еўрапейскую культурную прастору, а таксама дапамог крытыкам і мастакам Заходняй і Усходняй Еўропы пашырыць спектр іх прафесійных інтарэсаў.

***Паліна Грушына***

***Александр Ращупкин***

Фарфоровая Оля, пластмассовые сны.
"Хотите чаю, что ли? Он вкусный, пацаны."
И, вылепив из глины пустых вопросов тьму,
Хихикать будет длинно, неясно лишь — чему.
Фарфоровая Оля, пластмассовые сны,
Невидимые роли и поиски весны.
Но в мире всё прекрасное сожрали короли,
На фабрику напрасных игрушек привели.
Керамика опасно рассыпалась в слова,
На фабрику напрасных игрушек забрела
Пластмассовая Оля..."Хотите чаю, что ли?"
Потёртые штаны. Фарфоровые сны.

***

За что тебя любят мужчины?
Лукавый лунатик, ответь.
За что они рады терпеть,
Надеяться, ждать, как кретины,
А после с упорством невежд,
Обиженно губы покомкав,
Наивно искать сред обломков
Причину крушенья надежд?
Печальнее нет состязанья,
Где главный приз кто-то уж взял,
Но высится страсти накал,
Бегут все с упрямством бараньим.
Я б тоже бежал среди всех,
Но, к счастью, я слишком ленивый,
И, чтобы с тобой стать счастливым,
Мне нужен лишь полный успех.
Пускай же они тебя любят
И смотрят тревожные сны,
Тебя же наутро разбудит
Лишь тот, кого выбрала ты.

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная змена" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

*Газета падпісана ў друк у 12.00.*

*14 снежня*
*Зак 665.*
*Т. 1000 экз.*

*220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 206827.*

**В.а. рэдактара**
**Т.М. Казак**